# КОЖАР ГАННА СЦЯПАНАЎНА.
# ДА 95 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Ганна Сцяпанаўна Кожар нарадзілася ў в. Рагозіна Аршанскага раёна ў лютым 1919 г. (афіцыйная дата; па інш. крыніцах – у 1916 г.). У 1933 г., пасля сканчэння сямігодкі, працавала ў калгасе, на Аршанскім ільнокамбінаце. У 1935 г. паступіла на педрабфак у г. Дуброўна. Пасля яго сканчэння (1938) стала студэнткай геаграфічнага факультэта Магілёўскага педінстытута (адначасова працавала настаўніцай СШ № 4). Скончыць поўны курс інстытута перашкодзіла вайна.

У 1941–1943 гг. Ганна Сцяпанаўна вучыла дзяцей геаграфіі ў школах Кемераўскай вобласці і ваеннай спецартшколе. У 1943–1944 гг. працягнула вучобу, але ўжо на геафаку БДУ, які знаходзіўся ў эвакуацыі (чыг. ст. Сходня Маскоўскай вобл.). Ганна Сцяпанаўна з цеплынёй успамінала студэнтаў і выкладчыкаў-географаў МДУ імя М. Ламаносава, якія займаліся побач. Зносіны з імі было вельмі карыснымі для атрымання кваліфікацыі географа.

На прыканцы 1944 г. Г. Кожар вярнулася на Беларусь. Больш за 10 гадоў яна выкладала геаграфію ў Магілёўскім педвучылішчы і адначасова (1945–1956) працавала сумяшчальнікам у педінстытуце (старшы выкладчык кафедры прыродазнаўства, якую ўзначальваў Б.А. Крубіч-Лебедзеў). У 1957–1961 гг. Г. Кожар працавала старшым лабарантам кафедры эканамічнай геаграфіі. Затым, на працягу 8 гадоў (1961–1969) выкладала прыродазнаўчыя курсы на факультэце пачатковых класаў, глебазнаўства і геаграфію глебаў на геаграфічным факультэце, кіравала курсавымі працамі, далёкай комплекснай геаграфічнай практыкай, працавала над кандыдацкай дысертацыяй па тэме «Сельская гаспадарка Магілёўскай вобласці». Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1979). Г.С. Кожар – аўтар шэрагу артыкулаў па праблемах глебазнаўства, методыкі выкладання ў розных навуковых выданнях. Усе гады працы на геафаку Ганна Сцяпанаўна актыўна працавала ў Геаграфічным таварыстве і таварыстве аховы прыроды.

Увосень 1969 г. Г.С. Кожар па сямейных абставінах пераехала ў Мінск, дзе да сяр. 1980-х гг. працавала навуковым супрацоўнікам НДІ глебазнаўства НАНБ.

На першы погляд Ганна Сцяпанаўна была дастаткова суровым чалавекам. Але пад гэтай суровасцю хавалася цеплыня стаўлення да студэнтаў. Яна заўсёды была наперадзе, устойліва пераносіла цяжкасці палявых практык. У 50 гадовым узросце яна падымалася на Гергецкі ледавік на Каўказе, на вышыню ў 3,5 тыс. м на пік Іне ў Дамбае. Як выкладчык і навуковец яна найлепшым чынам паказала сябе на палявых практыках. Менавіта, пад час іх правядзення яна працавала неведаючы стомленасці.

Памерла Ганна Сцяпанаўна ў 1993 г. Пахавана ў Мінску.

*У.Г. Хамякоў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова